PolotskSU



**УДК 39**

# АРХИТЕКТОНИКА «ДЕРЕВЕНСКИХ СВЯТЫНЬ» СЕВЕРНОЙ БЕЛАРУСИ: ТРАДИЦИИ И АКТУАЛЬНОЕ СОСТОЯНИЕ

***В.А. Лобач***
Полоцкий государственный университет, Республика Беларусь
e-mail: nordic972@gmail.com

*Статья посвящена особенностям пространственной и символической организации «святых мест» на территории Северной Беларуси. Анализ источников XX – начала XXI века позволяют выделить 3 этапа развития архитектоники «деревенских святынь». В дореволюционное время преобладают деревянные часовни простой конструкции и кресты, обозначавшие культовый статус «святых мест». В советский период происходит уничтожение всех архитектурных и культовых атрибутов почитаемых природных объектов. При этом традиция поклонения святым источникам (камням) не прерывается. Для современности характерны как традиционные формы организации сакрального пространства (часовни, кресты), так и архитектурные новации, не имеющие ничего общего с традицией.*
***Ключевые слова**: сакральная география, культовые источники, традиционная культура, архитектоника, Северная Беларусь.*

# ARCHITECTONICS OF THE "VILLAGE HOLY PLACES" OF NORTHERN BELARUS: TRADITIONS AND CURRENT STATUS

***U. Lobach***
Polotsk State University, Republic of Belarus
e-mail: nordic972@gmail.com

*The article is devoted to the peculiarities of the spatial and symbolic organization of “holy places” in the territory of Northern Belarus. Analysis of the sources of the XX - early XXI century allows us to distinguish 3 stages in the development of the architectonics of “village shrines”. In pre-revolutionary times, wooden chapels of simple construction and crosses prevailed, denoting the cult status of “holy places”. During the Soviet period, all the architectural and cult attributes of revered natural objects were destroyed. At the same time, the tradition of worshiping holy sources (stones) is not interrupted. Modernity is characterized by both traditional forms of organizing sacred space (chapels, crosses) and architectural innovations that have nothing to do with tradition.*
***Keywords:** sacred geography, cult sources, Belarusian traditional culture, architectonics, Northern Belarus.*

# АРХІТЭКТОНІКА “ВЯСКОВЫХ СВЯТЫНЬ” ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ: ТРАДЫЦЫІ І АКТУАЛЬНЫ СТАН

**Уводзіны**. Ушанаванне прыродных аб’ектаў ёсць адной з вызначальных рысаў традыцыйнай культуры беларусаў Падзвіння (Паўночнай Беларусі). Архаічны, па сваёй

PolotskSU



сутнасці, культ святых крыніц (у меншай ступені – камянёў і дрэваў) па стане на XX – пачатак XXI ст. выявіў не толькі шырокую захаванасць на тэрыторыі рэгіёна (і ўсёй Беларусі ў цэлым), але ў апошнія дзясяцігоддзі перажывае своеасаблівы "рэнесанс". Фальклорныя, сімвалічныя, абрадавыя аспекты шанавання культавых прыродных аб'ектаў даволі грунтоўна распрацаваныя ў айчыннай гістарыяграфіі [1; 2; 3; 4; 5]. Пры гэтым, праблема прасторавай арганізацыі, кампазіцыйнага сэнса формы (архітэктонікі) "святых месцаў" у структуры лакальных культурных ландшафтаў практычна не разглядаліся, што вызначае актуальнасць і навізну прапанаванага даследвання.

**Асноўная частка**. Месца і роля шанаваных прыродных аб'ектаў у рэлігійных і абрадавых практыках вясковага насельніцтва вызначаецца, найперш, тым сімвалічным статусам, які мае святая крыніца ці камень у карціне свету лакальнай супольнасці. Адсюль, падаецца слушным вызначэнне такіх элементаў ландшафту як "вясковых святынь" (А.А. Панчанка), пад якімі разумеюцца "шанаваныя ландшафтныя аб'екты (артэфактычнага і прыроднага паходжання), якія не прадугледжаны кананічным царкоўным абіходам, але, у той жа час, адыгрываюць істотную ролю ў традыцыйнай рэлігійнай практыцы вяскоўца" [6, с. 12]. Спосаб і формы арганізацыі сакральнай прасторы, культурная атрыбутыка "вясковай святыні" цесна звязаныя як з уласнай міфалагічнай гісторыяй культавага аб'екта, яго фізічнымі параметрамі і лакалізацыяй, так і з канфесійнымі асаблівасцямі мікрарэгіёна, традыцыямі народнага дойлідства ў цэлым. У гэтым сэнсе, архітэктоніка шанаванага месца ёсць вынікам іератопіі – працэса "стварэння сакральнай прасторы, разгледжанага як асаблівы від творчасці, а гэтаксама як спецыяльная галіна гістарычных даследванняў, у якіх выяўляюцца і аналізуюцца канкрэтныя прыклады такой творчасці" [7, с. 10].

Праблема даследвання архітэктонікі "вясковых святынь" Беларускага Падзвіння палягае ў недастатковай колькасці крыніц па азначанай праблематыцы, а таксама той акалічнасцю, што феномен ушанавання прыродных аб'ектаў дагэтуль ёсць прадметным полем для этнографаў і фалькларыстаў, для якіх архітэктурная спецыфіка арганізацыі сакральнай прасторы мае хіба факультатыўнае значэнне. Як правіла, у народазнаўчых працах фіксуецца сам факт наяўнасці / адсутнасці капліцы (зруба, крыжа, агароджы) каля святой крыніцы, правядзенне абрадавых дзеянняў (малебен, абраканне, паломніцтва) і вусная гісторыя пра знішчэнне культавай атрыбутыкі ў савецкі час. Разам з тым, аналіз палявых экспедыцыйных матэрыялаў паказвае, што "найбольш пашыраным на тэрыторыі Беларусі атрыбутам культавых крыніц былі і ёсць капліцы, якія ў сельскай мясцовасці выконвалі функцыі храма" [5, с. 93]. Драўляныя капліцы, што ўзводзіліся над святымі крыніцамі ці побач з імі, належалі да самых простых і найбольш пашыраных на тэрыторыі Беларусі форм. "Самыя простыя з адчыненых капліц складаліся са слупа з дахам, пад якім размяшчалаўся абраз ці разная фігурка. Колькасць слупоў магла дасягаць чатырох, тады яны служылі асновай для шатровага даху... Слупы абшывалі дошкамі з трох ці чатырох бакоў, пераходзячы да больш складанага віду гэтых пабудоў" [8, с. 177].

Найбольш ранняя фрагментарная выява слупавой капліцы з шатровым дахам, пастаўленай над Святой крыніцай на Верхнім замку ў Полацку датуецца 1918 г. (малюнак 1). На сённяшні дзень архітэктоніка гэтай крыніцы арганізавана іншым чынам (малалюнак 2).

PolotskSU





**Малюнак 1. – Капліца над Святой крыніцай на Верхнім замку ў Полацку, 1918 г.**



**Малюнак 2. – Святая крыніца на Верхнім замку ў Полацку, 2018 г. (тут і далей - фота аўтара)**

У канцы XX ст. у сельскай мясцовасці слупавая канструкцыя над “вясковай святыняй” магла мець форму простай паветкі з двухсхільным дахам, якая ўзводзілася над зрубам. Асобнымі дэталямі капліцы над Марозавым ключом у в. Забор’е Расонскага р-на былі памост для зручнага набору вады і драўляная падстаўка для грашовых ахвяраванняў (малюнак 3). Паказальна, што намаганнямі вясковай грамады старая канструкцыя была ў пачатку 2000-х гг. заменена на трывалую слупавую капліцу з шатровых дахам, зруб вакол крыніцы быў накрыты драўляным памостам з адмысловым праёмам да вады, а вакольная прастора – упарадкавана. Аднак пры гэтым, драўляныя плашкі, з якіх складаўся дах паветкі былі заменены на штучны матэрыял – шыфер (малюнак 4).

PolotskSU



Ва ўспамінах вясковых старажылаў узгадкі пра арганізацыю прасторы святых крыніц даволі формульныя, няпэўныя і ўтрымліваюць недастакова падрабязных апісанняў. Аднак, у выпадках, калі ў размове фігуруе маленькі “домік”, падобны на “шкаф”, то, верагодна, вядзецца пра невялікія чатырохкутнія слупавыя канструкцыі, абшытыя дошкамі і накрытыя дахам, дзе змяшчаліся царкоўныя атрыбуты (абразы, распяцце, крыж) і ахвяры – ручнікі, фартухі, стужкі. У прыватнасці, менавіта такой, паводле ўспамінаў, была капліца над святой крыніцай у в. Дабрыгоры Бешанковіцкага р-на: “*Во тут ў нізіначцы стаяла каплічка. І бралі ваду, і мыліся, і пілі. І на празьнікі многа, многа людзей сабіралася. Во празьнік які: бралі, пілі, змываліся. Счыталася свянцоная вада. І гэту крынічку бацюшка асвяшчаў на Міколу… Каплічка тая прымерна была, вот, прымерна, як шкаф велічыні, і крышка пастаўлена над ёй і дзверцы. Над самай крынічкай. Крынічка ў сярэдзіне. Ікон не было, а крэст можа быў. У каплічку тую, мы ўжо ў школу хадзіць пачыналі, хаваліся у праткі. Патом яна разваліласяя*” [9, с. 197-198].



**Малюнак 3. – Капліца-паветка над Марозавым ключом у в. Забор’е Расонскага р-на, 1998 г.**



**Малюнак 4. – Слупавая капліца над Марозавым ключом у в. Забор’е Расонскага р-на, 2009 г.**

PolotskSU



Палявыя этнаграфічныя матэрыялы паказваюць, што найбольш распаўсюджанымі былі менавіта невялікія дашчаныя капліцы, якія маркіравалі культавую крыніцу і былі месцамі правядзення богаслужэнняў, а таксама ахвярапрынашэнняў мясцовага насельніцтва. Перавага падобных канструкцый тлумачыцца як іх прастатой і даволі простай тэхналогіяй будаўніцтва, так і экалагічнымі фактарамі. Вельмі часта крыніцы знаходзіліся ў нізінах, месцах вільготных і нават забалочаных, дзе ўзвядзенне масіўнай зрубнай канструкцыі было праблематычным. Падобнага роду капліца магла заглыбляцца ў грунт і, тым самым, існавала пагроза парушэння не толькі самой канструкцыі, але і геамарфалогіі ўласна крыніцы. Разам з тым, арганізацыя ўнутранай прасторы “святога месца” магла адрозніваецца. У выпадку калі крыніца не мела выразнага паверхневага выхаду, яе аб’ём размяшчаўся ў межах спецыяльна ўсталяванага зруба (калодзежа), над якім і будавалася капліца. Калі крыніца была праточнай, то яе рытуальная лімітацыя адбывалася толькі на пэўным участку вадатоку, дзеля чаго ў капліцы ўзводзіўся адмысловы драўляны памост з праёмам для набору вады. “*Тут у нас крыніца была… І там хадзілі, вадзічку бралі. Бяжыць тая вадзічка... Там жа была зроблена каплічка, над крыніцай гэтай. Такая ў рост чалавека. Іконкі там былі. Пол быў павышаны і тут жа ручаёк бег – вадзіца з крыніцы бегла пад гэты пол*” (в. Асецішча Докшыцкага р-на) [9, с. 210]. Паказальна, што ў другім выпадку “святой” лічылася вада, якую набіралі менавіта ў капліцы, а верхні і ніжні ўчасткі крынічнай ручаіны ў абрадавых практыках не выкарыстоўваліся.

Для культавых крыніц, якія не мелі паверхневага выхаду, мог выкарыстоўвацца больш просты спосаб арганізацыі сакральнай прасторы, калі капліца адсутнічала, а цэнтрам рытуальнай прасторы выступаў калодзежны зруб (са стрэшкай ці без) і разнастайная царкоўная атрыбутыка пры ім: крыж, распяцце, абразы. Як правіла, архітэктоніка падобнага тыпу знаходзіла адлюстраванне і ў мясцовай назве культавага аб’екта: “Святы калодзеж”, “Дзявічы калодзеж”, “Калодзеж Ерусалім” і да т.п. “*Там калодзесь, вадзічка харошая такая, і ўсе ўрэмя, як яна не пойдзець, так і сходзіць хто-небудзь туды. “Дзевочы калодзесь” называецца. Там і храсток стаяў, там і ўсе… там храсток стаяў, кожны год там убіралі, хадзілі там*” (в. Званае Полацкага р-на); “*Он быў небальшы дзеравянны зруб. Я ў бацькі свайго спрашывала, чаго тут калодзесь? А ён гаворыць: эта калодзеж святой. Русалім называецца… Ішлі з цэркві кросным ходам, па этай сцежкі ішлі к калодзежу. У бажэсцвенныя празнікі, нашчот Багародзіцы што-та*” (в. Пустынкі Сенненскага р-на) [9, с. 187, 227-228].

На тэрыторыі Беларускага Падзвіння зафіксаваныя выпадкі, калі прастора “вясковай святыні” кампанавалася амаль выключна з дапамогай прыродных аб’ектаў, а культурныя маркёры (крыж, абразы, ручнікі), якія пазначалі сакральны статус месца, мелі мінімалісцкі характар. Напрыклад, дрэва побач са святой крыніцай адыгрывала ролю ахвярніка, на ім размяшчалі культавыя атрыбуты, а зруб і капліца ў такім месцы маглі адсутнічаць (малюнкі 5-6). “*У Царкавішчы быў Святы дуб... І крынічка там ішла. Ля дуба яна воддаль трохі. (…) Было дуплё, туды ўкладалі і грошы, каторы багацейшы. Прасілі аб здароўі. Як галоўка, бывае, забаліць, ня сплю, пабягу к таму дубу вады. Там красіва – і возера блізенька, і Святы дуб, і Святая крынічка*” (в. Царкавішча Ушацкага р-на) [9, с. 216]; “*Святая крыніца пад Вішкавічамі. Чаму святая – не ведаю, але святыя людзі, ну каторыя верылі, хадзілі туды ўбіраць, у любы дзень. Вады набіралі. Людзі ходзяць, і я хадзіла... Лажылі грошы ўсе. Над гэтай*

PolotskSU



*крыніцай стаіць альха. У ёй было дупло, невысока, дык туды лажылі грошы, вот калі нада было вады. Дык я сама туды грошы лажыла. Крыж там быў”* (в. Баравыя Чашніцкага р-на) [9, с. 202].



**Малюнак 5. – Культавая крыніца “Святуха” ля в. Углы Полацкага р-на, 1998 г.**



**Малюнак 6. – Крыніца “Ізус” ля в. Вішкавічы Чашніцкага р-на, 2009 г.**

PolotskSU



Часам, рэлігійная атрыбутыка ля культавай крыніцы адсутнічала цалкам (прынамсі, не ўзгадваецца ва ўспамінах старажылаў). У дадзеным выпадку размова ідзе пра "вясковыя святыні" мікралакальнага маштабу, пра якія ведалі жыхары 1-2 бліжэйшых вёсак. Святасць падобных крыніц была "ўласнасцю" мясцовай фальклорнай гісторыі і не патрабавала верыфікацыі з боку афіцыйнай царквы (багаслужэнні ля такіх крыніц не праводзіліся). "*Крынічка была. Чапцы. Ну тожа мы хадзілі. Праўда, пілі мы гэтую ваду тожа. На Лаеўшчыну тут дарога была, вот хадзілі ў ягады. Ну, малыя, колькі нам, па 9, па 10 лет была. Ну і даходзім – там стаяў пянёк такой, і на гэты пянёк лажылі капеечкі ці што там было… Лажылі і пілі. Вот гавараць, што там свянцоная вада*" (в. Мікуліна Полацкага р-на) [9, с. 219].

Для разумення суадносінаў уласна прыроднага локуса, які ў карціне свету мясцовага насельніцтва мае статус "святыні", і культурных атрыбутаў, якія гэтую святасць маркіруюць, важна пазначыць, что марфалогія "святога месца" ў народнай традыцыі даволі складаная і ўключае ў сябе наступныя кампаненты: 1) фрагмент прыроднага ландшафту, 2) культавы аб'ект 3) "імя", 4) фальклорныя тэксты рознай жанравай прыроды (быліčкі, легенды, павер'і…), якія ў сукупнасці фармуюць вусную "агіяграфію" святога месца, 5) рытуалы, якія спраўляюцца пры яго наведванні [10, с. 158].

Адсюль вынікае, што прыродная святыня заўсёды ёсць першаснай у сістэме сімвалічнай іерархіі, у параўнанні з культурнымі атрыбутамі святасці (капліцамі, крыжамі, абразамі). "Капліцы… самі не былі аб'ектам культа, але з'яўляліся часам толькі дадатковым маркерам да шанаванага аб'екта і выконвалі, такім чынам, дапаможную ролю" [11, с. 34]. Пазначаная акалічнасць становіцца відавочнай у савецкі перыяд гісторыі, калі практычна ўся культавая атрыбутыка "вясковых святыняў" была знішчана, а царкоўныя службы каля іх былі спынены, але пры гэтым шанаванне святых крыніц (дрэваў ці камянёў) мясцовым насельніцтвам не перапынялася. "*І пры савецкай уласці сабіраліся людзі, хадзілі. Гэта ж каплічку тады разабралі. Разабралі, унічтожылі. А даўней каплічка стаяла дзеравянная. Разабралі яе дзе-та ў 1955-м, толькі крыж стаяў. Потым крыж кінулі ў крапіву...*" (в. Гараўцы Мёрскага р-на); "*І пры савецкай уласьці ўсё раўно хадзілі. Бацюшкаў не было адно ўрэмя, а людзі ўсё раўно прыхадзілі к этай крынічке. Храстоў не было, бацюшкаў не было, а людзі ішлі да крынічкі*" (в. Стайкі Ушацкага р-на) [9, с. 193, 211].

Трэба адзначыць, што спосаб арганізацыі сакральнай прасторы ля культавых дрэваў і камянёў мог адрозніваца ад архітэктонікі святых крыніц. Калі ля Святой ліпы (в. Падліпкі Шаркаўшчынскага р-на) была пабудаваная драўляная капліца для царкоўнай службы, то для святых дубоў (в. Упірэвічы Барысаўскага р-на, в. Новыя Валосавічы Лепельскага р-на, в. Царкавішча Ушацкага р-на) маркерамі іх культавага статуса выступалі крыжы, абразкі і ручнікі, павешаныя на дрэвах [9, с. 233-234]. Што датычыцца камянёў-следавікоў, шанаваных мясцовым насельніцтвам (в. Папкі Бешанковіцкага р-на, в. Улессе Докшыцкага р-на, в. Вял. Поўсвіж Лепельскага р-на), то культурныя атрыбуты (капліцы, крыжы, абразы) адсутнічалі цалкам, паколькі "след" на валуне, суаднесены ў народнай традыцыі з Богам, сам па сабе быў дастатковай пазнакай надзвычайнага, "святога" статуса каменя ў структуры лакальнага ландшафту [9, с. 236-237].

З 1990-х гг. у краіне адбываецца своеасаблівы "рэлігійны рэнесанс", звязаны з дзяржаўнай палітыкай лібералізацыі ў сферы веравызнання. У практычным вымярэнні

PolotskSU



гэта азначала як аднаўленне старых, разбураных ці занядбаных храмаў розных канфесій, вяртанне культавых пабудоў вернікам, а таксама будаўніцтва значнай колькасці новых цэркваў, касцёлаў, малітвенных дамоў. Адраджэнне рэлігійных традыцый і практык непасрэдным чынам закранула і сферу ўшанавання “вясковых святыняў”. У перыяд 1990-2010-х гг. на тэрыторыі Беларусі былі ўпарадкаваныя дзясяткі культавых крыніц, адноўлены капліцы, крыжы, зрубы, якія пазначаюць сакральны статус воднага аб’екта. Аднак, палявыя даследванні, праведзеныя на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, паказваюць, што ў большасці выпадкаў сучасная архітэктоніка святых месцаў значна адрозніваецца ад традыцыйных формаў арганізацыі сакральнай прасторы. У прыватнасці, замест драўляных капліц, якія існавалі раней, пачынаюць будавацца мураваныя канструкцыі з сілікатнай цэглы (вв. Бабруйшчына, Чарневічы Глыбоцкага р-на), якія выглядаюць даволі штучна ў кантэксце актуальнага прыроднага асяродка святой крыніцы (малюнкі 7-8). У шэрагу выпадкаў (Янава крыніца ля в. Чарневічы Глыбоцкага р-на, Крыніца “Серабранка” ў Расонскім р-не, Святая крыніца ля в. Красналучка Лепельскага р-на), ля шанаваных крыніц будуюцца “купальні”, якія ніколі не былі структурнай часткай культавага комплекса, роўна як і пагружэнне паломнікаў у крынічную ваду ніколі не ўваходзіла ў рытуальны сцэнарый паломніцтва да святой крыніцы.

Выкарыстанне сучасных будаўнічых матэрыялаў (бетон, цэмент, цэгла, шыфер ды і нш.) пры ўпарадкаванні прасторы культавых крыніц не толькі парушаюць эстэтыку святога месца, але, часам, ствараюць пагрозу і для самога воднага аб’екта. Так, пры аднаўленні зруба Святога калодзежа ля в. Маргавіца Докшыцкага р-на вакол яго была зроблена масіўная бетонная заліўка, якая парушыла геамарфалогію крыніцы і сапсавала якасць яе вады (мал. 9). Падобнае “добраўпарадкаванне” святога месца вельмі негатыўна ацэньваецца мясцовымі старажыламі. “*Вада была ня порцілася, а цяпер порціцца. Я не знаю чаму, казалі, што нядобрая цяпер вада...*”; “*А цяпер, як зробілі там і дно, і крышу, і абабілі, і стала вада ні тая. А цяпер зробілі саўраменную, цяпер яе ачысьцілі там, і вада ні такая*” [9, с. 209].



**Малюнак 7. – Капліца на Янавай крыніцы ля в. Чарневічы Глыбоцкага р-на, 2009 г.**

PolotskSU





**Малюнак 8. – Капліца на Янавай крыніцы ля в. Бабруйшчына Глыбоцкага р-на, 2001 г.**

Ініцыятыва мясцовых уладаў г. Сянно па прывядзенні ў належны стан культавай крыніцы “Пясчанка” па стане на 2008 г. выглядала няйначай, як прафанацыя святога месца, шанаванага мясцовым насельніцтвам (малюнкі 9-10). Невыпадкова, што і рэакцыя пажылых людзей на такі спосаб упарадкавання святога месца ёсць вельмі рэзкай і адмоўнай: “*Харошая была крынічка. Кідалі капеечкі бабы старыя… А цяпер, як паставілі там эту вышку, што яны там здзелалі, пазас..лі этыя крыніцы. Очань харошая там вада была, а як паставілі вышку – усё прапала*”[1].



**Малюнак 9. – Святы калодзеж ля в. Маргавіца Докшыцкага р-на, 2009 г.**

[1] Зап. Валодзіна Т., Лобач У. у 2008 г. ад Хадыкі Надзеі Васільеўны, 1936 г.н. у г. Сянно.

PolotskSU





**Малюнак 10. – Крыніца “Пясчанка” ў г. Сянно, 2008 г.**

**Заключэнне**. Прыведзеныя факты паказваюць на досыць сур’ёзную праблему, якая існуе ў сферы аднаўлення і рэкрэацыі культавых прыродных аб’ектаў у структуры лакальных ландшафтаў Беларусі. Як правіла, культавыя крыніцы (камяні, дрэвы) не ўваходзяць у рэестры помнікаў прыроды, гісторыі і культуры, у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Адпаведна, гэтыя ўнікальныя элементы культурнага ландшафту не падпадаюць пад ахоўныя мерапрыемствы дзяржавы, што азначае абсалютна адвольныя, ніякім чынам не ўзгодненыя са спецыялістамі, меры па арганізацыі сакральнай прасторы на сучасным этапе. У той жа час, кожная святая крыніца ці валун увасабляюць не толькі адметны вопыт узаемадзеяння людзей з навакольным светам, спецыфіку міфалагічных і рэлігійных уяўленняў беларусаў, але абсалютна рэальна ўключаны ў абрадавыя практыкі вясковага і гарадскога насельніцтва Беларусі. Такім чынам, актуальным і мэтазгодным падаецца наданне культавым прыродным аб’ектам статуса помнікаў прыроды, гісторыі і культуры і распрацоўка на дзяржаўным узроўні мерапрыемстваў па іх ахове і добраўпарадкаванні з улікам мясцовых традыцый і комплексных навуковых парадаў з боку спецыялістаў у галіне этнаграфіі, геаграфіі, архітэктуры, этнасеміётыкі і дызайну.

ЛІТАРАТУРА


1. Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э.А. Ляўкоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 215 с.
2. Зайкоўскі, Э.М. Жыватворныя крыніцы Беларусі / Э.М.Зайкоўскі, Л.У.Дучыц. – Мінск : Ураджай, 2001. – 111 с.
3. Дучыц, Л.У. Сакральная геаграфія Беларусі / Л. Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 384 с.
4. Карабанаў А.К. Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі / А.К. Карабанаў [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т прыродакарыстання. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 235 с.
5. Лобач, У.А. Святыя крыніцы Беларусі / У. А. Лобач, Т. В. Валодзіна. – Мінск: Беларус. навука, 2016. – 188 с.
6. Панченко, А.А. Исследования в области народного православия. Деревенские святыни Северо-Западной России / А. А. Панченко. – СПб. : Алитейя, 1998. – 298 с.

PolotskSU



7. Лидов, А.М. Создание сакральных пространств как вид творчества и предмет исторического исследования / А.М. Лидов // Иеротопия. Создание сакральных пространств в Византии и Древней Руси / ред., сост. А.М. Лидов. – М. : Индрик, 2006. – С. 9–31.
8. Сергачев, С.А. Белорусское народное зодчество / С.А. Сергачев. – Минск : Ураджай, 1992. – 225 с.
9. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 292 с.
10. Иванова, А. Святые места в районах межкультурной коммуникации / А. Иванова // Сакральная география в славянской и еврейской культурных традициях : сб. статей. Академическая серия. – М. : Гриф и К, 2008. – Вып. 22. – С. 155–165.
11. Платонов, Е.В. Часовни Тихвинского уезда (рубеж XIX – XX вв.) / Е.В. Платонов. – СПб.: ИЦ “Гуманитарная Академия”, 2011. – 304 с.

PolotskSU

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ
# АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ
# И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ

Электронный сборник статей

МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
(Новополоцк, 26–27 ноября 2020 г.)

Новополоцк
Полоцкий государственный университет
2021

Об издании – 1, 2

PolotskSU

1 – дополнительный экран – сведения об издании

УДК 72(082)

Редакционная коллегия:
Р. М. Платонова (председатель),
В. В. Васильева (отв. секретарь),
Л. М. Парфенова, Е. Д. Лазовский, В. Е. Овсейчик

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ** [Электронный ресурс] : электрон. сб. ст. Междунар. науч.-практ. конф., Новополоцк, 26–27 нояб. 2020 г. / Полоц. гос. ун-т ; редкол.: Р. М. Платонова [и др.]. – Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2021. – 1 электрон. опт. диск (CD-R).

ISBN 978-985-531-734-1.

Представлены итоги исследований, освещающие проблемы истории архитектуры, градостроительства и искусства, современной архитектуры, дизайна и строительства, научно-методические проблемы преподавания архитектурных, дизайнерских и строительных дисциплин.

Предназначен для специалистов в области архитектуры и проектирования, преподавателей, аспирантов, магистрантов и студентов архитектурных, дизайнерских и строительных специальностей.

*Сборник включен в Государственный регистр информационного ресурса.*
*Регистрационное свидетельство № 3671815379 от 26.04.2018.*

211440, ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, Беларусь
тел. 8 (0214) 59 95 11, e-mail: r.platonowa@psu.by; u.auseichyk@psu.by

**№ госрегистрации 3671815379.**
**ISBN 978-985-531-734-1** ©Полоцкий государственный университет, 2021

PolotskSU

2 – дополнительный титульный экран – производственно-технические сведения

Для создания текстового электронного издания «Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов» использованы текстовый процессор Microsoft Word и программа Adobe Acrobat XI Pro для создания и просмотра электронных публикаций в формате PDF.

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ**

Электронный сборник статей

МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
(Новополоцк, 26–27 ноября 2020 г.)

Технический редактор *А. А. Прадидова.*
Компьютерная верстка *А. А. Прадидовой.*
Компьютерный дизайн обложки *Е. А. Балабуевой.*

Подписано к использованию 27.04.2021.
Объем издания: 11,4 Мб. Тираж 3 диска. Заказ 420.

Издатель и полиграфическое исполнение:
учреждение образования «Полоцкий государственный университет».

Свидетельство о государственной регистрации
издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/305 от 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 от 08.05.2014.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк,
Тел. 8 (0214) 59-95-41, 59-95-44
http://www.psu.by